***На вусны прыём у Смаргонскі міжраённы аддзел Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы звярнулася грамадзянка «Н» з пытаннем: «Я ўладкавалася на працу ў адну з арганізацый раёна, якая займаецца пераборкай грыбоў (сезонная праца). Пры прыёме на работу са мною заключылі кантракт, але толькі на адзін год. Ці правільна гэта?»***

Главой 24 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей - ПК) вызначаны асаблівасці рэгулявання працы сезонных работнікаў.

Сезоннымі прызнаюцца работнікі, занятыя на працах, якія ў сілу прыродных і кліматычных умоў выконваюцца не круглы год, а на працягу пэўнага перыяду (сезону), які не перавышае шасці месяцаў.

З сезонным работнікам пры прыёме на працу заключаецца тэрміновы працоўны дагавор у пісьмовай форме (ч. 6 арт. 17 ПК). У тэрміновым працоўным дагаворы, заключаным з сезонным работнікам павінна быць паказана ўмова аб сезонным характары працы. Тэрмін такога працоўнага дагавора не можа перавышаць працягласць сезону. Не дапускаецца ўстанаўленне папярэдняга выпрабавання сезонным работнікам (арт. 300 ПК).

Такім чынам, наймальнік пры прыёме на працу грамадзяніна на час выканання сезоннай працы па пераборцы грыбоў павінен быў з ім заключыць працоўную дамову на час сезоннай працы, а не кантракт.

**Вяржынская Таццяна**,
галоўны дзяржаўны інспектар
Смаргонскага міжраённага аддзела
Гродзенскага абласнога ўпраўлення
Дэпартамента дзяржаўнай
інспекцыі працы